## *І. А. Юхо*

# СТАРАЖЫТНЫЯ КАРАНІ БЕЛАРУСІ

Імя нашае краіны – Беларусь, новае маладое імя, але яно мае вельмі старажытную гісторыю. Імя народа – гэта сродак жывых сацыяльных зносін, у якіх удзельнічаюць масы людзей. Калі імя народа як сімвал важных гістарычных падзей звязваецца з імёнамі асобных людзей, тады гісторыя набывае жывы чалавечы вобраз. У гісторыі Беларусі свецяцца яркімі зоркамі імёны знакамітых асветнікаў народа: Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Францыска Скарыны, Міколы Гусоўскага, Сымона Буднага, Адама Міцкевіча і інш.

Пачэснае месца ў гісторыі належыць выдатным дзяржаўным і грамадскім дзеячам: Усяславу Чарадзею, Віценю, Альгерду, Ягайле, Вітаўту, Андрэю Казіміру, Жыгімонту Казіміравічу, Мікалаю Радзівілу Чорнаму, Льву Сапегу, Андрэю Тадэвушу Касцюшку, а таксама многім змагарам за адраджэнне беларускай дзяржаўнасці і культуры ў XIX і XX ст.

Філасофскай распрацоўкай значэння імён у навуцы і гісторыі займаліся многія вучоныя пачынаючы са старажытных часоў: Сакрат, Платон, Арыстоцель і іншыя мысліцелі. Так, Платон у сачыненні «Краціл» пісаў: «Можна ў саміх імёнах адшукаць пацверджанне таго, што не адвольна ўсталёўваецца кожнае імя, а адпаведна з некаторай правільнасцю. Што ж датычыць імён герояў і людзей, якія нам захавала паданне, то яны нас могуць і ашукаць... першыя заснавальнікі імён не былі нікчэмнымі людзьмі, але былі ўдумлівымі назіральнікамі нябёсных з’яў і, я б сказаў, тонкімі знаўцамі слова».

Імя народа, дзяржавы, горада, паселішча і мясцовасці, а таксама і некаторых людзей сведчыла пра іх сутнасць, паходжанне, гісторыю, бо яно разглядалася як знак, сімвал, адзнака, прыкмета. Імя аб’екта або суб’екта знаёміць усіх з яго індывідуальнай асаблівасцю. Характарызуючы значэнне імя рэчы для штодзённага ўжытку і навукі, вядомы сучасны філосаф А. Лосеў пісаў: «Слова пра рэч ёсць слава рэчы, маніфест пра рэч; імя заўсёды абвяшчае, аб’яўляе, агалошвае аб рэчы. Імя выводзіць рэч вонкі з яе маркотнага ізаляванага становішча... Імя рэчы – гэта свет рэчы, промні, што яна выпраменьвае, вестка аб сабе, што яна пасылае, красамоўнае раскрыццё – для іншага, не проста для сябе, для іншабыцця, усялякага іншабыцця, для ўсяго, што захацела б уступіць з ёю ў зносіны». Імя народа мае вельмі

важнае значэнне, бо яно ўключае ў сябе сутнасць усёй яго гісторыі, гэта сімвал яго існавання. Дзякуючы свайму імені, народ набывае індывідуальную і калектыўную сутнасць, становіцца самім сабой і аддзяляецца ад іншых народаў, і разам з тым становіцца паўнапраўным суб'ектам сусветнай сям'і народаў.

Першае пісьмовае ўпамінанне пра людзей, што жылі на тэрыторыі старажытнай Беларусі, сустракаецца ў грэчаскага гісторыка Герадота, які жыў у V ст. да н. э. і называў нашых продкаў будзінамі і неўрамі. Ён пісаў: «Будзіны – вялікае і шматлікае племя; ува ўсіх іх светла-блакітныя вочы і рудыя валасы. У іхняй зямлі знаходзіцца драўляны горад пад назваю Гелон... Гарадская сцяна высокая і ўся драўляная. З дрэва пабудаваны таксама дамы і свяцілішчы... Уся зямля іх пакрыта густымі лясамі». Ён жа апавядае і пра неўраў, цары якіх разам з царамі будзінаў і іншых народаў удзельнічалі ў нарадах са скіфамі, каб разам абараніць скіфаў ад сямісоттысячнай арміі персідскага цара Дарыя.

Неўры раней вымушаны былі пакінуць сваю зямлю і пасяліцца сярод будзінаў.

Рымскія гісторыкі і географы Пампоній Мела, Гай Пліній Секунд, Карнелій Тацыт і іншыя, што жылі ў першых стагоддзях нашай эры, таксама пісалі пра будзінаў і неўраў, але ўжо ведалі і іншыя імёны для нашых продкаў, такія, як венеды і сарматы. Візантыйскія і сярэднявечныя еўрапейскія пісьменнікі і гісторыкі да гэтых імён яшчэ дадавалі славян, русь, драгавітаў, крэвічаў, радзімічаў, бужан і ліцьвінаў.

Імя будзінаў, якіх пазней сталі называць бужанамі, крэвічамі і драгавітамі, для нашага народа ўзнікла невыпадкова, але яго дакладнае паходжанне пакуль што невядома. Магчыма, што яно паходзіць ад слова будаваць, будзіны – будаўнікі. Вядома, што нашу краіну ў сярэднявечча называлі краінай гарадоў Гардарыкай. Ананімны баварскі географ пісаў у сярэдзіне IX ст., што свіране мелі 325 гарадоў, бужане – 231, тураўчане – 104, пружане – 70, гарады меліся ў жыцічаў і лукамлян. Такім чынам выходзіць, што ў сярэдзіне IX ст. на Беларусі было больш за 730 гарадоў. Але нашыя археолагі ігнаруюць гэтыя звесткі і калі знойдуць нейкае старажытнае паселішча, то называюць яго не горадам, а гарадзішчам, нібыта ў нас не было гарадоў.

Аналізуючы запісы старажытных аўтараў пра будзінаў, П. Шафарык пісаў, што іх добра ведаў К. Пталамей, які адзначаў, што рэчка Барысфен (або Бярэзіна) пачынаецца з зямлі Будзінскай, сучаснік Пталамея грэк Агафадзямон размяшчаў будзінаў каля ракі Буг, пра іх жа пісалі таксама Аміян Марцэлін, Юлій Ганорый, Эцік і Стэфан

Візантыйскі. Далей Шафарык піша: «Зыходзячы з гэтых сведчанняў, няма сумнення, што вялікі і шматлюдны народ – будзіны – займалі калісьці сваімі пабудовамі ўсю сучасную Валынь і Беларусь... Будзіны былі, уласна кажучы, адзін і той жа народ з венедамі і, такім чынам, адной, і прытым галоўнай, галіною вялікага сербскага пакалення... Будзіны мелі сваю мову... А такой мовай была мова славянская».

З імем будзінаў (гудзінаў, вудзінаў) звязаны і назвы паселішчаў на нашай зямлі: Буда, Будзілава, Будзішкі, Будслаў, Гуды, Гудагай, Гудзевічы, возера Будавесць і шэраг іншых. Ад будзінаў паходзяць і многія асабістыя імёны і прозвішчы нашых людзей: Будны, Будзівід, Будзікід, Будзіловіч, Будзінскі, Будзяка і іншыя.

Імя неўраў, або у славянскім напісанні нарцаў, якіх Герадот размяшчае на зямлі будзінаў, таксама мае невыпадковае значэнне. У «Аповесці мінулых гадоў» ёсць такі запіс: «Нарцы, еже суть словяне». Рагожскі летапісец запісаў: «Бысть язык словенскый от племене Афетова нарицаемы норицы иже суть словене». Імя неўраў паходзіць са старажытнай санскрыцкай (арыйскай) мовы, у якой *нара* азначае чалавек.

Герадот паведамляе, што цары неўраў на нарадзе са скіфамі адмовіліся ім дапамагаць у вайне з персамі, бо лічылі вайну несправядлівай, бо першымі яе пачалі скіфы. Але заявілі, што калі персы прыйдуць на іх зямлю, то яны не дапусцяць гэтага.

З імем неўраў, нарцаў звязана і назва ўсіх славян – «народ». П. Шафарык імя неўраў тлумачыў старажытным славянскім словам *нуръ*. Ён пісаў: «Імя зямлі Nevpia, як называў яе грэк, або *нуръ*, як называў славянін, ёсць чыста славянская назва, бо слова *нуръ* у старажытнаславянскай мове абазначае зямля». Ад гэтых імёнаў народа і зямлі паходзяць геаграфічныя назвы нашых азёр, рэк, паселішчаў, а таксама асабістыя прозвішчы і імёны людзей: Нарач, Нараў, Нараўлянка, Нароўля, Нарова, Нарашы, Наруцэвічы, Нур, Нурэц, Нарановіч, Нарбут, Нарбутовіч, Наркевіч, Нарушэвіч, Нарымонт.

Імя славяне для нашага народа атрымала шырокую вядомасць у V–VII ст. н. э. пасля слаўных заваёў у Паўднёвай і Цэнтральнай Еўропе і набыцця славы сярод іншых народаў. У папярэднія гады яны былі вядомы пад імёнамі венедаў, склавінаў, антаў. Іх першапачатковыя паселішчы, гарады і вёскі займалі тэрыторыю на поўнач ад Карпацкіх гор у басейнах рэк Віслы, Дняпра, Буга, Нёмана, Заходняй Дзвіны. Упершыню імя «славяне» ў пісьмовых помніках Заходняй Еўропы з'явілася ў пачатку VI ст. у вершы біскупа Марціна, дзе ён пералічваў імёны народаў, што пазналі сапраўднага Бога. Безумоўна, імя славян

узнікла значна раней, да іх шырокага рассялення на прасторах Еўропы. Збройныя паходы славян з свае старажытнае зямлі на поўдзень і захад пачаліся ў канцы другога стагоддзя і працягваліся ў наступныя гады, а дасягнулі сваёй кульмінацыі ў V і VI ст., калі яны збройнай сілай, пры дасканалай дзяржаўнай і вайсковай арганізацыі ўтварылі свае новыя дзяржавы на Балканскім паўвостраве і ў Цэнтральнай Еўропе на захад ад ракі Одэр і дасягнулі ніжняга цячэння Эльбы і паўднёвых берагоў Балтыйскага мора.

Асабліва паспяховымі былі ваенныя дзеянні славян і іх саюзнікаў у VI ст. супраць Візантыі. Па звестках візантыйскіх гісторыкаў славяне рабілі свае напады на Візантыю, якая пры кожным нападзе страчвала да 200 тысяч жыхароў. Разам з тым былі выпадкі, калі славяне дзейнічалі як саюзнікі Візантыі. Так, у 537 г. конніца склавінаў і антаў удзельнічала ў аблозе Рыма. Але часцей за ўсё яны дзейнічалі як ворагі Візантыі. У 540–542 гг. яны захапілі вялікую колькасць візантыйскіх гарадоў і ўмацаванняў і нават уварваліся ў прыгарад Канстанцінопаля. Напады на Канстанцінопаль працягваліся ў наступныя гады. Добра арганізаванае войска славян дзейнічала па загадзя распрацаваным плане, вяло адкрытыя баі з прафесійным візантыйскім войскам. У 578 г. стотысячнае войска славян перайшло Дунай, спустошыла некалькі правінцый на Балканах. У 616 г. славяне напалі на горад Фесалоніку, акружыўшы яго з сушы і з мора. Візантыйскі аўтар лічыў, што толькі цуды святога Дзмітрыя выратавалі горад ад захопу.

Славяне, што жылі на старажытнай Беларусі ў другой палове першага тысячагоддзя, мелі яшчэ мясцовыя імёны крэвічаў, драгавітаў, бужан, радзімічаў, а некаторыя з іх, як, напрыклад, крэвічы, падзяліліся на палачан, смальнян, велетаў, люцічаў. Частка велетаў у V–VI ст. захапілі ў германцаў тэрыторыю на захад ад Одэра да Эльбы. Прарадзімай велетаў Шафарык лічыў паўночна-заходнюю Беларусь. Ён пісаў, што прарадзімай велетаў (люцічаў, вільцаў) быў Віленскі край. «Велеты выступілі з края Віленскага, якога адна частка вядомай была некалі пад імем Вількаміра, гэта значыць зямля Ваўкоў, Воўкастан... Велеты, якія славіліся зухаватасцю і ваяўнічасцю... Веравызнанне і грамадскае кіраванне былі ў іх значна лепей і больш дасканала наладжаны, чым у іншых славян. Усё гэта гаворыць нам пра незвычайную грамадзянскую асвету, якой гэтыя велеты дасягнулі».

Імёнамі венедаў і сарматаў у першыя стагоддзі нашай эры называлі славян рымскія і грэчаскія гісторыкі Тацыт, Пталамей, Іардан. Імёны венедаў, вентаў, вендаў, віндаў яшчэ да нашай эры былі вядо-

мыя ў паўночнай Італіі. Магчыма нават, што гэта яны пабудавалі славутую Венецыю.

У IV–VII ст. у сувязі з так званым перасяленнем народаў Еўропы адбыўся працэс распаду старых этнічных груповак і дзяржаў і ўтварэння новых народнасцей і дзяржаў, у сувязі з чым замест агульных імён славяне, венеды, сарматы ўзнікаюць новыя імёны: крывічы, драговіты, сербы, харваты, чэхі, русь і інш. У той жа час у візантыйскіх хроніках славян называюць скіфамі, аб чым сведчыць Цвярскі летапіс. У ім было запісана: «И жывяху в мире Поляне, Древляне, Север, Бужане, Родимичи, Вятичи, Хорваты, Дулебы же живяху по Богу, где ныне Велыняне. О Лутичах. А Лутичи и Тиверичи приседаху к Дунаеви; и бе множество их седяаху по Днестру полны до моря, и суть грады их до сего дне, да то ся зовет от Грек Великая Скифия».

Герадот, расказваючы пра скіфаў, падае некалькі легенд аб іх паходжанні. Па адной з іх, першым жыхаром на паўночным узбярэжжы Чорнага мора быў чалавек па імені Таргіталай, у якога было некалькі сыноў. Ад старэйшага, Ліпаксаіса, узяло пачатак скіфскае племя, якое называлі Аўхатамі. Імя Аўхаты ў перакладзе з грэчаскай мовы азначае «слаўныя». На думку І. Забеліна, гэтая назва можа адносіцца і да славян. У цеснай сувязі з гэтай легендай знаходзіцца і легенда пра славян і скіфаў, выкладзеная ў Іакімаўскім летапісе, пра двух братоў Славена і Скіфа, ад імён якіх утварыліся імёны славян і скіфаў. Рацыянальнае зерне гэтых легенд сведчыць пра аўтахтоннасць славян ва Усходняй Еўропе і, па-другое, што дзяржаўны лад і княжацкая ўлада ўтварыліся ў славян і скіфаў задоўга да нашай эры. Тым самым абвяргаецца думка летапісца Нестара і некаторых гісторыкаў, што нібыта славяне прыйшлі на нашу зямлю толькі ў VI ст. з Дуная і што нібыта дзяржаўны лад у іх быў створаны прышлымі варагамі, якія разам з тым прынеслі і новае імя Русь.

Імя Русь для часткі нашага народа пачало ўжывацца ў X–XI ст. Асноўныя спрэчкі вакол гэтага імя вядуцца наконт таго, ці было яно этнічным, канфесіянальным або сацыяльным. На думку многіх гісторыкаў, спачатку яно было сацыяльным, калі ім называлі толькі ваяроў або купцоў, потым яно стала, пасля прыняцця кіеўскімі жыхарамі хрысціянскай веры, канфесіянальным. У X–XI ст. набыло этнічнае і дзяржаўна-палітычнае значэнне для жыхароў правабярэжнай Украіны, а ў XIV–XVI ст. імя Русь, Росія стала набываць і дзяржаўна-палітычнае значэнне для Маскоўскай дзяржавы.

У сярэднявеччы існаваў міф пра трох братоў Чэха, Леха і Руса, ад якіх паходзяць імёны трох народаў: чэхаў, палякаў і рускіх. Гэты міф быў выкладзены ў Хроніцы вялікапольскай, напісанай на лацінскай мове прыкладна ў 1295 г. Гэты ж міф быў выкладзены ў кнізе Пракопа Слабады, выдадзенай у Загрэбе ў 1767 г., у якой было запісана: «Добра ведаю... у 276 г. адышоў вельмі знатны вяльможа Чэх з братамі сваімі Лехам і Русам, а таксама з усімі сваімі прыяцелямі і родам». Гэты міф сцвярджае два важныя факты. Першае, што народнасці чэхаў, палякаў і русі як самастойныя этнасы ўтварыліся адначасова не пазней VII–VIII ст.; па-другое, што іх утварэнню садзейнічалі працэсы, звязаныя з этнічным самаўсведамленнем. У той жа час, на аснове адзінай рэлігійнай ідэалогіі крэваў і вайскова-дзяржаўнага адзінства крэвічаў-драгавітаў, утварылася адзіная народнасць крэвічаў, пазней названых ліцьвінамі, а ў XIX–XX ст. – беларусамі. Вядома таксама, што славяне прымалі ўдзел у паходах гунаў у IV–V ст. Гільём Рубрук, які ў 1253 г. праязджаў праз Русь, адзначаў, што «мова рускіх, палякаў, чэхаў і славян адна і тая ж з моваю вандалаў, атрад якіх усіх разам быў з гунамі».

У трактаце візантыйскага імператара Канстанціна VII Багранароднага імя Русь ужываецца ў двух значэннях – як геаграфічная назва тэрыторыі і як сацыяльнае імя акрэсленай групы людзей. Ён пісаў: «Аднадрэўкі знешняй Русі, якія прыплываюць у Канстанцінопаль, плывуць з Ноўгарада, у якім сядзеў Святаслаў, брат Ігара, князя Русі. Ёсць і з Смаленска, і з Любеча, і Чарнігава, і з Вышгорада. Усе яны спускаюцца рэчкаю Дняпром і збіраюцца каля Кіева... Зімні ж лад жыцця росаў суровы і складаецца з наступнага: калі надыходзіць лістапад месяц, адразу выходзяць іх князі з усімі росамі з Кіева і адпраўляюцца ў палюддзе». Зразумела, што росы, якія ўсе выходзілі з Кіева, – гэта толькі частка жыхароў, разам з якімі князі выходзілі збіраць дані. Знаны даследчык рускай гісторыі дзяржавы і права С. Юшкоў пісаў: «Як намі высветлена, руссю называюцца ў помніках IX–X ст. адмысловыя сацыяльныя групы, узнікшыя на тэрыторыі ўсходняга славянства».

Пасля прыняцця хрысціянскай веры часткай славян імя русь набывае канфесійнае значэнне. Ім абазначаюцца людзі, што прынялі хрысціянскую веру ад святароў, падпарадкаваных мітрапаліту Кіеўскаму, які называўся рускім.

Імя Русь, як імя сацыяльнай, рэлігійнай, этнічнай групы людзей, а затым як імя тэрыторыі і дзяржавы, узнікла не ў адначассе і не па

адной нейкай выпадковай прычыне. Яго не прынеслі нейкія іншаземцы. Яно складалася і развівалася на працягу некалькіх стагоддзяў, калі набыло сучаснае этнічнае і дзяржаўна-палітычнае значэнне. На яго ўзнікненне і развіццё ўздзейнічалі назвы рэк (Рось – прыток Нёмана), паселішчаў, імёны людзей, тагачасная рэлігія, грэчаская мова і яшчэ дзесяткі розных прычын. Усё гэта замацавалася ў свядомасці многіх пакаленняў людзей. Імя Русь як сімвал увасабляе ў сабе веліч і сілу вады, зямлі, жыццёвую энергію старажытных ваяроў, падарожнікаў, купцоў. Асабліва яно набыло сілу, зліўшыся з імем Белая, сімвалам вольнасці, свабоды, чысціні, целам і душою. Чысціня душою – адзнака справядлівасці і міласцівасці. Паходжанне імя Русь, Рос цесна звязана са словамі *рост, расці*, а значыць, з энергіяй росту, энергіяй маладосці. Зліццё двух імён Русь і Белая ў адно – Беларусь захавала ў сабе і памножыла энергію сваіх папярэдніх імён.

Імя Сарматы, Сарматыя для нашай краіны і народа ўжывалі ў асноўным грэчаскія, рымскія і сярэднявечныя польскія гісторыкі. Узнікненне гэтага імя было звязана са з’яўленнем у паўночным Прычарнамор’і іранамоўных народаў, якія ў першым тысячагоддзі да н. э. занялі тэрыторыю, на якой раней размяшчаліся скіфы, і прасунуліся на паўночны захад. Старажытныя географы Пампоній Мела і Клаўдзій Пталамей, якія жылі ў пачатку першага тысячагоддзя н. э., размяшчалі сарматаў у басейнах Віслы і Дняпра. У XVI–XVIII ст. у Польшчы і Вялікім княстве Літоўскім, пад уплывам імя Сарматаў узнікла шляхецкая ідэалогія «сарматызм», згодна з якой нібыта саслоў’е шляхты – гэта нашчадкі сарматаў, якія падняволілі сабе карэннае насельніцтва гэтых краін. На самой жа справе, калі нават мела месца пранікненне некаторай часткі сарматаў на нашу зямлю, то яны хутка аславяніліся і нічым не адрозніваліся ад асноўнай масы насельніцтва. У сярэднявеччы імя Сарматы ўжывалі для народаў Беларусі, Польшчы, Украіны і інш. Мацей Мяхоўскі ў сваім «Трактаце аб двух Сарматыях», выдадзеным у 1517 г., пісаў: «Старажытныя адрознівалі дзве Сарматыі, суседнія і сумежныя адна ад адной, адну – у Еўропе, другую ў Азіі. У еўрапейскай ёсць вобласці русаў або рутэнаў (сучасная Украіна. – *І. Ю.*), літоўцаў, москаў і іншыя, прылягаючыя да іх, паміж ракой Віслай на захадзе і Танаісам на ўсходзе... У азіяцкай жа Сарматыі, на прасторы ад ракі Дона або Танаіса на захадзе, да Каспійскага мора на ўсходзе». Называў нашу краіну Сарматыей і Сымон Будны, калі пісаў: «...у нас у Сарматыі... у нашай Сарматыі». Імя Сарматы таксама мела некаторы ўплыў на гістарычны лёс нашага

народа і на наданне шляхетнасці і высакароднасці нашаму новаму назову Ліцьвіны.

Імя Літва, ліцьвіны, Вялікае княства Літоўскае ўжывалася ў адносінах да нашай краіны амаль 700 гадоў, а ўтвораная нашымі продкамі дзяржава – Вялікае княства Літоўскае праіснавала 600 гадоў. Спачатку гэтае імя, так як імя Русь, вызначала толькі сацыяльную групу ваяроў-малайцоў, потым славян-язычнікаў, якія жылі на нашай зямлі, а ў XIV–XVIII ст. яно распаўсюдзілася на ўсё насельніцтва Вялікага княства Літоўскага і стала дзяржаўным. На ўзнікненне гэтага імя ўздзейнічалі шмат розных фактараў і прычын, сярод якіх найбольш уплывовымі былі мовазнаўчыя – ад слова *ліць*, старажытнага слова *літаваць* – замацоўваць, знітоўваць, нават жэрдкі, якімі накрываўся стог сена, называюцца ліцьвінамі; і этнічныя – імёны славян Люцічаў – Вільцаў – Волатаў і асабістыя імёны – Літавор, Лінгвен – ваяроў літаў, што неслі службу ў мясцовых князёў або проста займаліся рабункам. В. Тацішчаў паведамляе, што ў 1239 г. «вялікі князь Яраслаў Усеваладавіч хадзіў на Літву, баронячы смальнян, і, перамогшы Літву, пасадзіў у Смаленску князя Усевалода Мсціславіча, унука Рамана Мсціславіча». А быў тою літвою полацкі князь Святаслаў Мсціслававіч, які захапіў Смаленск у 1232 г.

З гэтага паведамлення вынікае, што ўжо ў 1239 г. палачан называюць ліцьвінамі. Пра напады літоўцаў на ўкраінскія землі ўзгадваў італьянец Плана Карпіні, які ехаў у 1246 г. праз Украіну да татара-манголаў. Ён пісаў: «Князь паслаў з намі да Кіева аднаго служку. Тым не менш, мы ехалі заўсёды ў смяротнай небяспецы з-за літоўцаў, якія часта і ўпотай, наколькі маглі, рабілі напады на зямлю Русі і асабліва ў тых месцах, праз якія мы павінны былі праязджаць... з-за страху перад літоўцамі, якія часта рабуюць на дарогах ад Польшчы да зямлі Татар». Пра славянскае паходжанне сярэднявечных ліцьвінаў даволі грунтоўна выкладзена ў кнігах М. Ермаловіча і артыкулах Вітаўта Чаропкі, надрукаваных у «Літаратуры і Мастацтве».

Літвою называлі Беларусь як у Польшчы, так і ў Маскоўскай дзяржаве не толькі ў XIV–XVIII ст., але нават у XIX і на пачатку XX ст. Польскія гісторыкі да самага апошняга часу для нашага краю ўжывалі толькі найменні Літва або Польшча. Так Станіслаў Кутшэба (1876–1946) у сваёй грунтоўнай працы «Гісторыя дзяржаўнага ладу Польшчы ў нарысе» другі том цалкам прысвяціў Літве (Вялікаму княству Літоўскаму). Тадэвуш Корзан (1839–1918), які нарадзіўся і

юнацкія гады пражыў у Мінску, напісаў шэраг выдатных прац па гісторыі, але такога імя, як Беларусь, не ўжываў.

У расійскіх гістарычных крыніцах, як афіцыйных, так і прыватных, амаль да канца XIX ст. наш край называлі Літвой або Польшчай. Упершыню імя Літва ў расійскай гісторыі адносна Беларусі сустракаецца пад 1130 г., калі «Вялікі князь Мсціслаў хадзіў з войскам у Літву і, спустошыўшы шматлікія іх паселішчы, з многім палонам вярнуўся ў Ноўгарад. А адтуль прыйшоў у Кіеў». Пачынаючы з XIV ст. амаль усе беларускія гарады называюцца літоўскімі: Барысаў, Віцебск, Вільня, Гальшаны, Горваль, Друцк, Заслаўе, Клецк, Крэва, Лагойск, Лукомль, Менск і інш. Амаль да канца XIX ст. заходняя частка нашай краіны працягвала называцца Літвой, а горад Брэст называўся Літоўскім да 1919 г.

Імя Польшча для нашай краіны пачало ўжывацца пасля Люблінскай уніі 1569 г. польскімі палітыкамі, якія падмянялі назву дзяржавы Рэч Паспалітая найменнем Польшча. Часткай Польшчы называлі Беларусь і ў Расіі ў XVIII ст. У наказе Кацярыны II ад 28 траўня 1772 г. генерал-губернатарам Пскоўскай і Магілёўскай губерняў было запісана: «Прычыны, якія нас прымусілі далучыць некаторыя правінцыі Польскай Рэспублікі да імперыі нашае, вы ўгледзіце з друкаванага аб тым маніфеста». З гэтага запісу відаць, што нейкія абставіны прымусілі царскі ўрад называць Беларусь «правінцыяй Польшчы». Падобны запіс ёсць і ва ўказе 1772 г. генерал-губернатару, якому загадвалася «...над далучанымі ад Польшчы да імперыі нашай землямі... Загадаць абнесці ўсю прастору новых межаў ад аднаго краю да другога слупамі з імператарскім нашым гербам, каб потым у прыватных межах з літоўцамі нідзе спрэчак заставацца не магло».

Але імя Польшча навязвалася нашай краіне найбольш упарта шавіністамі з Польшчы і асабліва польскай каталіцкай царквой, пачынаючы з 1387 г., калі пачалося масавае прымусовае хрышчэнне ў каталіцкую веру язычнікаў і часткова праваслаўных, што вяло да апалячвання значнай часткі этнічных беларусаў. Асабліва ўзмацнілася апалячванне і русіфікацыя нашага народа пасля далучэння Беларусі да Расіі і ліквідацыі уніяцкай царквы. У Заходняй Беларусі, што знаходзілася пад уладай Польшчы з 1920 г. па верасень 1939 г., апалячванне было афіцыйнай палітыкай польскай дзяржавы.

У цяжкай барацьбе супраць апалячвання і русіфікацыі наш народ вымушаны быў прымірыцца са стратай свайго слаўнага імя Літва і

пагадзіцца на навязанае яму Маскоўскай дзяржавай новае імя Беларусь, якое паходзіць ад імя Белая Русь, якім у XV–XVI ст. называлася Маскоўская дзяржава.

Імя Белая Русь упершыню з’явілася ў XII ст. В. Тацішчаў адзначаў, што імя Белая Русь у летапісах упершыню ўпамінаецца пад 1135 г. у Раскольніцкім і Растоўскім манускрыптах. Больш часта ўжыванне гэтага тэрміна адносіцца да другой паловы XII ст.

У летапісах вялікі князь Андрэй Юр’евіч (Багалюбскі) з 1157 г. называецца ўжо князем Белай Русі. «По смерти Юриеве ростовцы, суздальцы и володимирцы, со всеми городы здумавше, пояше Андрея, старейшего Юриева сына, и посадиша его на отчи столе во всей Белой Руси, в Ростове и Суздале». «Я всю Белую (Суздальскую. – *І. Ю.*) Русь городами и селами великими населил и многолюдной учинил», – гаварыў, выхваляючыся, князь Андрэй Багалюбскі. Аналізу тэрміна «Белая Русь» В. Тацішчаў прысвяціў цэлы раздзел сваёй працы, у якой пісаў: «О причине же имени сего разные мнения находятся, Герберштейн и другие от множества снегов написали, токмо сие неправо, ибо Великой Руси, где стужи и снегов более бывает, паче бы согласовало. Польские и некоторые наши кладут от белого платья, которое при дворе царском в почтении было. Но и сие несогласно, ибо в Белой Руси более овец серых, следственно, и платья серого, нежели в Малой Руси... Древние наши писатели разумели под оным именем Польский и Мережской или Суздальский и Ростовский пределы с принадлежностьми, после Смоленское или Кревич, которое было особное владение, к тому привосокупили. Литовские, хотя похитить титул великих князей белорусских, обладав Смоленском, оное токмо за Белую Русь почли».

Белаю Руссю называлі Маскоўска-Суздальскую Русь і пасля ўтварэння рускай цэнтралізаванай дзяржавы. У XV ст. найменне Белая Русь мела тое ж значэнне, што Вялікая Русь, і ніяк не было звязана з тэрыторыяй сучаснай Беларусі. «Можна, здаецца, упэўнена сказаць, – пісаў прафесар В. Ламанскі, – што ў канцы XV і ў XVI ст., калі пад Белаю Руссю разумелі вольную і незалежную, то мелі на ўвазе не Белую Русь ва ўласным сэнсе, а Русь паўночна-ўсходнюю, Маскоўскую». Пры вялікім князю Іване III тэрмін «Белая Русь» уносіцца ў тытул вялікага князя Маскоўскага. Пад Белаю Руссю разумелася і ўся падуладная Багдану Хмяльніцкаму Украіна. Цікавыя ў гэтых адносінах звесткі ёсць у выпісцы з «Распросных речей полоняников в Патриаршем дворцовом приказе», дзе чытаем: «...завялі яго у Кіеў,

жыў у беларусца... радзіма яго ў Белай Русі ў Хваставе». Трохі іншае разуменне тэрміна «Белая Русь» даецца ў «Хроніцы Еўрапейскай Сарматыі», якая напісана італьянцам Аляксандрам Гвагніні ў 1578 г., што быў на службе ў горадзе Віцебску. Вось што ён пісаў: «А ёсць Русь траякая: адна Белая, другая Чорная, трэцяя Чырвоная. Белая каля Кіева, Мазыра, Мсціслаўля, Віцебска, Оршы, Полацка, Смаленска і зямлі Северскай, якая здаўна належыць Вялікаму княству Літоўскаму.

Чорная ў Маскоўскай зямлі каля Белага возера і там усюды да Азіі. Чырвоная каля гор, якія называюцца Бескідамі... Пад тымі ж гарамі паветы: Галіцкі, Перамышльскі, Саноцкі, а ў сярэдзіне вядомы горад Львоў... Абмяжоўваецца зямля з поўдня Татрамі, ракою Днястром; з усходу ракою Танаісам (Донам) і Перакопскаю зямлёю, з поўначы Літоўскаю зямлёю, а з заходу Польшчаю».

Трэба адзначыць, што польскія гісторыкі ў XVI ст. не ведалі дакладна, дзе знаходзіцца Белая Русь. Так, вядомы польскі вучоны, былы рэктар Кракаўскага універсітэта Мацей Мяхоўскі, які выдаў у 1517 г. «Трактат пра дзве Сарматыі», значнае месца адвёў апісанню Вялікага княства Літоўскага і Маскоўскай дзяржавы. Але ён усяго адзін раз успомніў пра Белую Русь, адзначыўшы, што яна размешчана недзе «між Уралам і Азоўскім морам». Пра Чорную Русь ён зусім не ўспамінае. З гэтых выказванняў самых розных аўтараў можна зрабіць вывады: 1) найменне «Чорная Русь» ніколі не ўжывалася самім насельніцтвам Беларусі, не было яно вядома ў якасці этнаграфічнага тэрміна і бліжэйшым суседзям і ўжывалася да розных тэрыторый; 2) тэрмін «Белая Русь» таксама амаль не ўжываўся да XVIII ст. для вызначэння цяперашняй Беларусі.

Адабранне ад нашага народа яго старажытнага імя Літва мела дзве прычыны: палякі стараліся навязаць імя Польшчы, а рускія – імя Русі, Белай Русі. Гэтыя дзеянні нашых суседзяў асабліва актывізаваліся ў другой палове XVIII ст. і на працягу ўсяго XIX ст. Вынікам яго было тое, што на пачатку XX ст. жыхары Беларусі ўжо не называлі сябе літоўцамі, але яшчэ і не прызвычаіліся да імя Беларусь, а таму сталі ўжываць найменне *тутэйшыя*. Спатрэбілася доўгая праца народа і яго найбольш выдатных дзеячаў, каб умацавалася ў свядомасці народа імя Беларусь.

Першае ўжыванне тэрміна «беларускі», якое паслужыла пачаткам этнаграфічнай назвы нашага народа, адносіцца да 1675 г., калі праваслаўны епіскап Феадосій, архімандрыт Слуцкага манастыра, атрымаў пацвярджальны прывілей на епіскапства Магілёўскае. У гэтым пры-

вілеі епіскап Феадосій упершыню тытулаваны як «беларускі», што паслужыла пачаткам афіцыйнага прыняцця гэтага тэрміна. Спачатку «беларускай» называлася толькі Магілёўская праваслаўная епархія, потым паступова гэтым тэрмінам называюць усе землі, на якія пашыралася ўлада магілёўскага епіскапа. Пасля далучэння ў 1772 г. паўночна-ўсходніх зямель Беларусі да Расіі гэта найменне набывае новае адміністрацыйна-геаграфічнае значэнне. Ім абазначаюць дзве новыя створаныя губерні: Пскоўскую (пасля пераўтвораную ў Полацкую) і Магілёўскую. Напрыклад, у пастанове Сената ад 8 мая 1773 г. гаварылася: «...учредя с самого начала в присоединенных к Российской империи из польских земель двух новых белорусских губерниях». У снежні 1796 г. былі ўнесены змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, паводле якога Полацкая і Магілёўская губерні былі пераўтвораны ў адну Беларускую губерню з цэнтрам у горадзе Віцебску. Віленская і Слонімская губерні захавалі старажытную назву і ўтварылі адну Літоўскую губерню з цэнтрам у горадзе Вільні. У склад Літоўскай губерні былі ўключаны наступныя паветы: Слонімскі, Навагрудскі, Гродзенскі, Ваўкавыскі, Лідскі, Брэсцкі, Кобрынскі, Пружанскі, Віленскі, Завілейскі, Трокскі, Браслаўскі, Ашмянскі і інш. З гэтага пераліку відаць, што нават у самым канцы XVIII і пачатку XIX ст. значная частка Беларусі афіцыйна называлася яшчэ Літвою.

У 1840 г. цар Мікалай I загадаў не ўжываць у афіцыйных дакументах наймення Беларусь і Літва, а таму было прыдумана нам новае імя «северо-западный край».

Паступова, з ростам нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, на працягу XIX ст. тэрмін «Беларусь» пачынае пашырацца на Мінскую губерню і некаторыя паветы Віленскай, а потым і на Гродзенскую. Пра маруднае пашырэнне новага тэрміна можа сведчыць той факт, што нават у 1918 г. горад Брэст называўся яшчэ Літоўскім.

У развіцці нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа выдатная роля належыць паўстанню 1863 г. пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага, якое ўскалыхнула грамадскую думку ў краіне і павысіла свядомасць усяго народа.

У другой палове XIX ст. тэрмін «Беларусь» пачынае набываць яго сучаснае геаграфічнае, этнаграфічнае і дзяржаўна-палітычнае значэнне. У развіцці і станаўленні гэтага тэрміна вялікая заслуга належыць нашым палітыкам, этнографам, гісторыкам, мовазнаўцам, літаратарам і іншым грамадскім і культурным дзеячам Беларусі. Асаблівай пашаны заслугоўваюць Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Кас-

тусь Каліноўскі, Францішак Багушэвіч, Яўхім Карскі, Усевалод Ігнатоўскі, Мітрафан Доўнар-Запольскі, Якуб Колас, Янка Купала, Іван і Антон Луцкевічы, Браніслаў Тарашкевіч, Язэп Лёсік, Зміцер Жылуновіч, Аляксандр Чарвякоў.

Імя Беларусь у цяперашні час набыло сваю славу, сваю сусветную вядомасць, сваё гаспадарчае і культурнае значэнне. Беларусь заняла свой «пачэсны пасад між народамі». Таму прапановы некаторых палітычных дзеячаў вярнуць, па прыкладзе шэрагу афрыканскіх дзяржаў, нашай дзяржаве сваё старое імя Вялікае княства Літоўскае, альбо Літва, не маюць цяпер дастатковых рэальных падстаў, бо сучаснае імя Беларусь нам Богам дадзена і народам замацавана, апрача таго, перамена імя можа парушыць усю сучасную беларускую культуру, сучасную славу нашага народа, набытую гераічнай барацьбой і цяжкай працай многіх яго пакаленняў.